Установа вышэйшай адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_______________ А.В.Макоўчык
“21” ________ 2022 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-2-30 / вуч.

# ГІСТОРЫЯ ЗАМЕЖНАГА І БЕЛАРУСКАГА МОВАЗНАЎСТВА

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйнай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:**

1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура;
1 – 02 03 03 Беларуская мова і літаратура.
Замежная мова (з указаннем мовы)

2022 г.

Вучэбная праграма распрацавана на аснове адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01-2021 і АСВА 1-02 03 03-2021, вучэбных планаў для спецыяльнасцей 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура; 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы).

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Ю.В.Чарнякевіч, дацент кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

М.Р.Прыгодзіч, загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар;

Н.В.Заяц, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар ДУА «Гімназія № 18 г. Мінска» ________ А.А.Венская

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 12 ад 19.05.2022 г.)
Загадчык кафедры ________ Д.В.Дзятко

Навукова-метадычным саветам ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 7 ад 21.06.2022 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела ________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

“Гісторыя замежнага і беларускага мовазнаўства” – вучэбная дысцыпліна, якая знаёміць студэнтаў са станам і напрамкамі развіцця сусветнай і айчыннай лінгвістычнай думкі, пачынаючы ад першых упамінанняў пра мову да навуковых распрацовак айчынных і замежных мовазнаўцаў канца ХХ – пачатку ХХІ стст. Гэтая вучэбная дысцыпліна знаёміць будучых настаўнікаў-філолагаў з разнастайнасцю моў свету, заканамернасцямі іх гістарычнага развіцця, з гісторыяй і відамі пісьма, з асноўнымі паняццямі і тэрмінамі лінгвістыкі, без ведання якіх немагчыма сур’ёзна займацца навукай пра мову. Дадзены курс падрыхтоўвае студэнта-філолага да вывучэння іншых прадметаў лінгвістычнага цыклу, дапамагае яму зразумець сутнасць кожнай лінгвістычнай дысцыпліны. Веды па гісторыі замежнага і беларускага мовазнаўства неабходныя для разумення шляхоў і спосабаў фарміравання розных замежных моў, беларускай нацыянальнай мовы, а таксама прагназавання яе далейшага развіцця ва ўмовах дзяржаўнага беларуска-рускага двухмоўя. Праз знаёмства з гісторыяй навукі ўдасканальваюцца метады даследавання, дасягаецца большая эфектыўнасць яе практычных вынікаў.

**Мэта вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя замежнага і беларускага мовазнаўства”:**

– абагульніць і сістэматызаваць веды навучэнцаў пра асноўныя этапы развіцця замежнага і беларускага мовазнаўства і важнейшыя тэарэтычныя дасягненні айчынных і замежных навукоўцаў;

– развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне студэнта, павысіць яго лінгвістычную кампетэнцыю;

– развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне студэнта, навыкі крытычнага аналізу найбольш складаных тэарэтычных з’яў;

– выпрацаваць уменні і навыкі практычнай рэалізацыі атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;

– садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, здольных паспяхова вырашаць праблемы функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму;

– выхаваць любоў і павагу да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

**Задачы вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя замежнага і беларускага мовазнаўства”:**

– даць навукова абгрунтаваныя тэарэтычныя веды па дысцыпліне;

– абапіраючыся на навуковыя і вучэбныя выданні, паказаць станаўленне і развіццё замежнай і беларускай філалагічнай навукі, пазнаёміць студэнтаў са спецыяльнай літаратурай;

– паказаць некаторыя спецыфічныя асаблівасці розных моў (як славянскіх, так і неславянскіх) у галіне фанетыкі і граматыкі;

– раскрыць заканамернасці функцыянавання літаратурнай мовы як складанай шматузроўневай сістэмы;

– пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі заканамернасцямі гістарычнага развіцця моў, з гісторыяй і відамі пісьма, з найважнейшымі тэорыямі паходжання мовы;

– пазнаёміць студэнтаў з рознымі напрамкамі і канцэпцыямі ў замежнай і беларускай лінгвістыцы, паказаць дыскусійнасць асобных меркаванняў і падыходаў у дачыненні да класіфікацыі моўных адзінак;

– сфарміраваць устойлівыя навыкі аналізу моўных фактаў;

– даць неабходныя звесткі пра асноўныя праблемы і прынцыпы метадалогіі лінгвістычных даследаванняў, традыцыйныя і больш новыя метады вывучэння мовы;

– садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых спецыялістаў, здольных практычна выкарыстоўваць набытыя веды пры вывучэнні спецыяльных мовазнаўчых дысцыплін.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў шэрагу іншых дысцыплін.*

Сярод лінгвістычных дысцыплін, якія выкладаюцца на філалагічных факультэтах ВНУ Рэспублікі Беларусь, “Гісторыя замежнага і беларускага мовазнаўства” займае адно з найважнейшых месцаў у сістэме падрыхтоўкі настаўнікаў-філолагаў. Гэта самастойная лінгвістычная дысцыпліна, якая мае свой прадмет вывучэння, метады і прыёмы аналізу.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.*

Вучэбная дысцыпліны “Гісторыя замежнага і беларускага мовазнаўства” звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як “Сучасная беларуская літаратурная мова”, “Беларуская дыялекталогія”, “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”, “Уводзіны ў мовазнаўства”, “Агульнае мовазнаўства”, а таксама са школьным курсам беларускай мовы.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Марфалогія (іменныя часціны мовы)” павінна забяспечыць фарміраванне:

- у студэнтаў спецыяльнасці 1-02 03 01 “Беларуская мова і літаратура” *СК-7.* Характарызаваць асноўныя этапы станаўлення і развіцця айчыннага і замежнага мовазнаўства.

- у студэнтаў спецыяльнасці 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы) *СК-3.* Выкарыстоўваць паняційны і тэрміналагічны апарат лінгвістыкі, улічваючы унутранную моўную сістэму , ажыцўляць класіфікацыю і аналіз лінгвістычных адзінак пры апісанні моўнага матэрыялу; *СК-8.* Характарызаваць асноўныя этапы станаўлення і развіцця айчыннага і замежнага мовазнаўства.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:**

– гісторыю станаўлення і этапы развіцця замежнай і беларускай лінгвістыкі;

– асноўныя праблемы сучаснай замежнай і беларускай лінгвістыкі;

– асноўныя дасягненні айчынных навукоўцаў у галіне беларускай лексікаграфіі, фразеаграфіі, этымалогіі, фанетыцы, марфалогіі, сінтаксісе, словаўтварэнні і іншых галінах мовазнаўчай навукі;

– навуковую, вучэбную і даведачную літаратуру па дадзенай галіне мовазнаўчай навукі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **умець:**

– адбіраць, аналізаваць і сістэматызаваць моўныя факты;

– праводзіць лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады;

– заўважаць агульнае і адметнае ў моўных фактах розных моў;

– карыстацца слоўнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі і дадатковай літаратурай;

– выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **валодаць:**

– сістэмай тэарэтычных ведаў па гісторыі развіцця замежнай і нацыянальнай лінгвістыкі;

– навыкамі гістарычнага аналізу моўных фактаў;

– навыкамі практычнага выкарыстання тэарэтычных ведаў па гісторыі развіцця замежнай і нацыянальнай лінгвістыкі;

– навыкамі гістарычнага аналізу моўных фактаў;

– навыкамі практычнага выкарыстання тэарэтычных ведаў пры аналізе розных лінгвістычных тэорый;

– уменнем разглядаць сучасныя моўныя факты ў іх гістарычнай дынаміцы.

Вучэбная дысцыпліна чытаецца на 2 курсе ў 1-ым семестры. У адпаведнасці з вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя замежнага і беларускага мовазнаўства” для спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура і спецыяльнасці 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова ўсяго адводзіцца 96 гадзін. Аўдыторных 46 гадзін, самастойная праца 50 гадзін.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

*Размеркаванне гадзін на дзённым аддзяленні на 2 курсе:*

| семестр | усяго гадзін | аўдыторныя | лекцыі | практычныя | КСР | | самаст. праца | форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | лк | пр | | |
| 1 | 96 | 46 | 20 | 22 | 2 | 2 | 50 | экзамен |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**1. Прадмет і задачы гісторыі замежнага і беларускага мовазнаўства.** Прадмет, змест і задачы курса "Гісторыя замежнага і беларускага мовазнаўства", яе месца ў сістэме філалагічнай адукацыі. Асноўныя вучэбныя дапаможнікі па дысцыпліне. Сувязь гісторыі замежнага і айчыннага мовазнаўства з іншымі навукамі. Перыядызацыя гісторыі беларускага мовазнаўства. Крыніцы вывучэння гісторыі беларускага мовазнаўства. Бібліяграфіі і агляды прац па беларускім мовазнаўстве.

**2. Гістарычныя перадумовы мовазнаўства як навукі.**

**2.1. Вывучэнне мовы ў старажытныя часы.** Мовазнаўства ў старажытнай Індыі. Граматыка Паніні (V ст. да н. э.). Эмпірычнае апісанне ў граматыцы Паніні фанетыкі і марфалогіі санскрыту. Мовазнаўства ў старажытнай Грэцыі. Філасофскі перыяд (V – III стст. да н. э.) грэчаскага мовазнаўства (распрацоўка праблем паходжання мовы, прыроды назвы, суадносін мовы і мыслення). Пытанні мовазнаўства ў працах Арыстоцеля (384–322 гг. да н. э.). Уклад стоікаў у распрацоўку граматычных праблем. Александрыйскі, або граматычны, перыяд (III ст. да н. э. – IV ст. н. э.) у вывучэнні мовы. Даследаванні александрыйскіх граматыстаў у галіне фанетыкі і граматыкі. Мовазнаўства ў старажытным Рыме. Найважнейшыя працы старажытнарымскіх мовазнаўцаў. Значэнне антычных даследаванняў мовы ў станаўленні мовазнаўства як навукі.

**2.2. Мовазнаўства ў эпоху Сярэднявечча і Адраджэння.** Лінгвістычныя даследаванні ў часы Сярэднявечча (V – XV стст. н. э.). Праблема сутнасці мовы і сутнасці найменняў у сярэднявечнай філасофіі. Пытанне пра паходжанне мовы. Дасягненні арабскага (дзяржава Арабскі Халіфат, VII – XIII стст.) мовазнаўства ў галіне граматыкі і лексікаграфіі. Мовазнаўства ў эпоху Адраджэння (XIV – XVII стст.). Станаўленне нацыянальных моў і іх вывучэнне. Першыя славянскія граматыкі, граматыкі Л. Зізанія (1596) і М. Сматрыцкага (1619). «Граматыка агульная і рацыянальная» (1660) А. Арно і К. Лансло. Натуралістычныя тэорыі паходжання мовы (выклічнікавая, гукапераймальная, сацыяльнай дамоўленасці) у французскай і нямецкай філасофіі XVIII ст. (Ж. Русо, Д. Дзідро, Г. Лейбніц, І. Гердэр). Лексікаграфічныя працы П. Паласа («Параўнальныя слоўнікі ўсіх моў і народаў», 1787–1789; 2 выд.,1790–1791), Л. Герваса («Каталог моў вядомых народаў...», 1784; 2 выд., 1800–1804), І. Адэлунга і І. Фатэра («Мітрыдат, або Агульнае мовазнаўства», 1806–1817). «Расійская граматыка» (1755) М.Ламаносава.

**3. Параўнальна-гістарычнае мовазнаўства.**

**3.1. Найважнейшыя перадумовы для ўзнікнення параўнальна-гістарычнага мовазнаўства.** Росквіт жывых літаратурных моў, стварэнне перакладных слоўнікаў, адкрыццё еўрапейцамі старажытнаіндыйскай мовы санскрыту, практычная работа па напісанні граматык і слоўнікаў розных моў.

Спроба І. Скалігера сістэматызаваць усе еўрапейскія мовы ў кн. «Разважанні пра еўрапейскія мовы» (1599). У. Джоунз (1746–1794) пра паходжанне некаторых еўрапейскіх моў (грэчаскай, лацінскай, гоцкай і інш.) і санскрыту з агульнай прамовы. Ф.Шлегель (1772–1829) пра роднасць санскрыту з лацінскай, грэчаскай, германскай і персідскай мовамі. Ф.Боп (1791–1867) пра гістарычную роднасць індаеўрапейскіх моў. Р.Раск (1787–1832) пра агульную для еўрапейцаў мову-крыніцу, пра падабенства моў, прынцыпы навуковай этымалогіі слоў і параўнальнага апісання моў. «Нямецкая граматыка» (1819–1837) Я.Грыма (1785–1863). А.Востокаў (1781–1864) пра перыядызацыю развіцця славянскіх і рускай моў, гукавое значэнне насавых галосных, гукавыя працэсы, звязаныя з стратай рэдукаваных, пра першую і другую палаталізацыю, пра лексічныя крытэрыі вызначэння ступені роднасці моў (першасныя і другасныя словы).

**3.2. Развіццё параўнальна-гістарычнага мовазнаўства (кампаратывістыкі) ў другой палове XIX ст.** Значэнне ўзнікнення параўнальна-гістарычнага мовазнаўства. Праўнальна-гістарычнае даследаванне моў у сучасны перыяд. В.Гумбальт (1767–1835) як заснавальнік агульнага мовазнаўства. А.Шляйхер (1821–1868) як заснавальнік натуралістычнага кірунку ў лінгвістыцы. Асноўныя тыпы моў паводле марфалагічнай класіфікацыі А.Шляйхера. Стадыянальнасць у развіцці моў. Тэорыя радаслоўнага дрэва індаеўрапейскіх моў. Прамова і яе рэканструкцыя. Г.Штайнталь (1823–1899) як заснавальнік псіхалагічнай школы ў мовазнаўстве. Псіхалагічная трактоўка сутнасці і працэсаў развіцця мовы.

**4. Младаграматычны кірунак і дзейнасць Ф. дэ Сасюра.**

**4.1. Младаграматычны кірунак у мовазнаўстве**. Младаграматысты пра актуальнасць вывучэння жывых моў, пра найважнейшыя навуковыя прынцыпы вывучэння мовы (псіхалагізм, індывідуалізм, гістарызм, атамізм). Вучэнне пра фанетычныя законы і змяненне значэнняў слоў. Роля аналогіі ў развіцці мовы. Роля ідэй младаграматыстаў у развіцці лінгвістычных кірункаў (дыялекталогіі, лінгвагеаграфіі, эстэтызму) і школ. Праблемы агульнага мовазнаўства ў працах І.Бадуэна дэ Куртэнэ (1845–1929). Пытанні агульнага мовазнаўства ў працах П.Фартунатава (1848 –1914).

**4.2. Ф. дэ Сасюр як заснавальнік сучаснай тэарэтычнай лінгвістыкі.** Праблемы агульнага мовазнаўства ў працах Ф. дэ Сасюра. Вызначэнне спецыфікі мовазнаўства як навукі. Адрозненне мовы і маўлення як двух аспектаў маўленчай дзейнасці. Знешняя і ўнутраная лінгвістыка, сінхранія і дыяхранія. Сістэмнасць мовы. Сінтагматычныя і асацыяцыйныя (парадыгматычныя) адносіны паміж моўнымі знакамі. Азначальнае (план выражэння) і азначаемае (план зместу) моўнага знака. Значнасць (вартасць) знака. Значнасць і значэнне. Уласцівасці моўнага знака. Адвольнасць (нематываванасць) сувязі азначальнага і азначаемага і абавязковасць знака для мовы. Роля Ф. дэ Сасюра ва ўзнікненні сацыяльнай лінгвістыкі і

лінгвасеміётыкі. Уплыў ідэй Ф. дэ Сасюра на развіццё сучаснай лінгвістыкі (структуралізму).

**5. Развіццё ўсходнеславянскага мовазнаўства ў XX – пачатку XXI стст. і сучасная лінгвістыка.**

**5.1. Развіццё ўсходнеславянскага мовазнаўства ў XX ст.** Праблема суадносін мовы і грамадства ў мовазнаўстве 20–30-х гадоў (Р.Шор, В.Жырмунскі, Л.Якубінскі і інш.). Агульналінгвістычныя погляды Л.Шчэрбы (1880–1944). «Новае вучэнне пра мову» М.Мара (1864/65–1934). Агульналінгвістычныя праблемы ў працах Я.Дз.Паліванава (1891–1938). Агульналінгвістычныя погляды А.Смірніцкага (1902/03–1954). Тыпалагічная канцэпцыя І.Мешчанінава (1883–1967). Агульналінгвістычныя праблемы ў працах В.Вінаградава (1894/95–1969) (граматычнае вучэнне пра слова, лексікалогія і фразеалогія, сінтаксічная тэорыя, моўныя стылі, мова мастацкай літаратуры). Уклад усходнеславянскіх лінгвістаў у тэорыю мовазнаўства.

**5.2. Сучасная лінгвістыка і інтэрлінгвістыка.** Мовазнаўства на сучасным этапе (антрапацэнтрычны кірунак, пераарыентацыя з аналізу на сінтэз, пашырэнне колькасна-статыстычных метадаў, лінгвістычная універсалогія, камп’ютэрная лінгвістыка, тэорыя маўленчых актаў і маўленчага ўздзеяння, функцыянальная граматыка, макракампаратывістыка і інш.). Праблемы кагнітыўнай лінгвістыкі. Асноўныя паняцці кагнітыўнай лінгвістыкі. Праблемы камунікатыўнай лінгвістыкі. Праблемы прыкладной лінгвістыкі. Пытанні мадэлявання мовы ў дзеянні. Камп’ютэрная лінгвістыка. Праблемы інфармацыйна-пошукавых аспектаў прыкладной лінгвістыкі. Праблемы сацыялінгвістыкі. Мова і грамадства. Праблемы класіфікацыі сацыялінгвістычных фактараў. Сацыялінгвістычныя фактары ў развіцці сістэмы мовы. Сучасная моўная сітуацыя і яе вывучэнне. Праблемы псіхалінгвістыкі. Этапы развіцця псіхалінгвістыкі. Кампаратывістыка на мяжы 19 – 20 ст. Праблемы ўнутранай рэканструкцыі. Прынцыпы арэальнай (прасторавай) лінгвістыкі ў сучасным параўнальна-гістарычным мовазнаўстве. Праблема праславянскай прарадзімы.

**6. Гісторыя развіцця беларускага мовазнаўства часоў старажытнасці.**

**6.1. Развіццё граматычнай думкі ва ўсходніх славян.** Пераклад і тлумачэнне незразумелых слоў на палях і ў тэксце беларускіх старадрукаў. Францыск Скарына, Васіль Цяпінскі, Сымон Будны, Іван Фёдараў, Мялецій Сматрыцкі і іх мовазнаўчая дзейнасць.

**6.2**. **Старажытныя лексікаграфічныя выданні**. «Лексіс» Лаўрэнція Зізанія, «Лексікон славенароскі» Памвы Бярынды і інш. Буквары, граматыкі і іншыя вучэбныя дапаможнікі (І.Фёдараў, С.Собаль, Л.Зізаній, М.Сматрыцкі, І.Ужэвіч). Юрый Крыжаніч як даследчык беларускай мовы.

**7. Вывучэнне беларускай мовы ў XIX ст.**

**7.1. Галоўныя кірункі ў даследаванні беларускай мовы першай паловы XIX ст.** Адносіны грамадскасці да беларускай мовы. Погляды А.Меера, К.Калайдовіча, Ф.Галатузава, П.Шпілеўскага. Першыя працы аб

беларускай мове (С.-Б.Ліндэ, К.Калайдовіч, П.Шафарык, І.Грыгаровіч). Ян Чачот як даследчык беларускай мовы. Беларускі матэрыял у шматмоўным слоўніку Ф.Шымкевіча. Уплыў грамадска-палітычных абставін на навуковую распрацоўку беларускай мовы.

**7.2. Даследаванне беларускай мовы другой паловы XIX – пачатку XX стст.** Роля К.Каліноўскага і Ф.Багушэвіча ў абуджэнні цікавасці да мовы беларускага народа. Этналінгвістычнае апісанне беларусаў. Вывучэнне мясцовых гаворак (П.Шэйн, Е.Раманаў, М.Янчук, М.Доўнар-Запольскі, А.Сержпутоўскі, М.Федароўскі, М.Нікіфароўскі, С.Мікуцкі і інш.). Лінгвістычная спадчына І.Насовіча, яго «Слоўнік беларускай мовы» (1870). Вывучэнне гісторыі беларускай мовы (А.Патабня, І.Сразнеўскі, Ф.Фартунатаў, А.Шахматаў, У.Даль, А.Сабалеўскі, Ф.Буслаеў, П.Уладзіміраў, А.Весялоўскі, Я.Будэ, А.Брукнер і інш.). Яўхім Карскі – заснавальнік беларускага мовазнаўства. Агульныя звесткі пра навуковую дзейнасць Я.Карскага. Працы Я.Карскага па дыялекталогіі і гісторыі беларускай мовы. «Беларусы» – энцыклапедыя беларусазнаўства. Вывучэнне дыялектнай мовы. «Этнографическая карта белорусского племени» (1903) Я.Карскага.

**8. Гісторыя даследавання беларускай мовы ў першай палове XX ст.**

**8.1. Распрацоўка беларускай нацыянальнай тэрміналогіі ў першай палове XX ст.** Беларуская лексікаграфія ў даваенны час. Стварэнне Навукова-тэрміналагічнай камісіі (люты 1921 г.) і Інстытута беларускай культуры (студзень 1922 г.). Зыходная база пры стварэнні беларускай навуковай тэрміналогіі і пошукі канцэпцыі яе распрацоўкі. Першыя публікацыі Навукова-тэрміналагічнай камісіі. Выданні серыі «Беларуская навуковая тэрміналогія» і іншыя тэрміналагічныя слоўнікі 20-х – пачатку 30-х гадоў. Лексікаграфічныя працы братоў М. і Г.Гарэцкіх. М.Байкоў і яго лексікаграфічная дзейнасць. «Беларуска-расійскі слоўнік» 1926 г. і «Расійска-беларускі слоўнік» 1928 г. М.Байкова і С.Некрашэвіча. «Падручны беларуска-польскі слоўнік» Б.Друцкага-Падбярэскага (Вільня, 1929). «Яўрэйска-беларускі слоўнік» С.Плаўніка і Н.Рубінштэйна (1932). «Сямімоўны слоўнік» (Лейпцыг, 1918). «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» В.Ластоўскага. «Руска-беларускі слоўнік» пад рэдакцыяй А.Александровіча (1937).

**8.2. Даследаванне фанетыкі і граматыкі беларускай мовы ў першай палове XX ст.** «Беларуская граматыка для школ» (1918) Б.Тарашкевіча – пачатак унармавання беларускай літаратурнай мовы. Значэнне «Беларускай граматыкі» (1918) Б.Пачобкі і «Зоркі» (1918) А.Смоліча ў школьнай адукацыі. Першыя правапісныя дапаможнікі Я.Лёсіка і праца «Правапіс спрэчных дзеясло́ўных форм» С.Некрашэвіча. Арфаграфічная дыскусія сярэдзіны 20-х гадоў. Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі 1926 г. Рэформа правапісу беларускай мовы 1933 года. Дэкрэт СНК БССР «Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу» ад 26 жніўня 1933 года. Першы навуковы курс сучаснай беларускай мовы пад рэдакцыяй Ц.Ломцева (1935 –

1940). «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі» В.Ластоўскага. Лінгвістычныя пытанні на старонках часопісаў («Крывіч», «Калоссе», «Шлях моладзі»).

**8.3. Дыялекталагічныя, гістарычныя, славістычныя і этымалагічныя даследаванні ў першай палове ХХ ст.** Асаблівасці беларускіх гаворак у артыкулах замежных мовазнаўцаў (Г.Ільінскі, М.Коген, Л.Асоўскі, М.Дурнаво, В.Ганцоў, І.Галанаў і інш.). Праграма па вывучэнні беларускіх гаворак Я.Карскага і яго падручнік «Русская диалектология» (1924). Дзейнасць П.Растаргуева. Даследаванні беларускіх гаворак С.Некрашэвіча і І.Воўка-Левановіча. «Спроба лінгвістычнае геаграфіі Беларусі» П.Бузука (1928) – адзін з першых славянскіх дыялекталагічных атласаў. Дыялектная лексікаграфія 20-ых гадоў (М.Каспяровіч, М.Шатэрнік і інш.). «Лекцыі па гісторыі беларускай мовы» (1927) і іншыя працы І.Воўка-Левановіча. Даследаванне праблемы паходжання беларускай мовы. Падрыхтоўка да стварэння гістарычнага слоўніка беларускай мовы. Распрацоўка праблем гісторыі беларускай мовы за межамі Беларусі (Х.Станг, А.Мартэль). Леў Цвяткоў як славіст. Славістычныя распрацоўкі П.Бузука і І.Воўка-Левановіча. Этымалагічныя даследаванні М.Когена.

**9. Гісторыя даследавання беларускай мовы ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стст.**

**9.1. Даследаванне фанетыкі і граматыкі беларускай мовы ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стст.** Станаўленне на Беларусі эксперыментальнай фанетыкі. Манаграфія А.Падлужнага і В.Чэкмана «Гукі беларускай мовы» (1973). Калектыўная праца «Галосныя гукі беларускай мовы» (1975). Навуковая дзейнасць Л.Выгоннай, А.Крывіцкага, А.Падлужнага, В.Чэкмана і інш. Пытанні націску, інтанацыі і іншых фанетычных сродкаў у даследаваннях М.Бірылы, Л.Вардамацкага, Л.Выгоннай і інш. Арфаэпічныя пытанні ў працах М.Бірылы, А.Падлужнага, Ф.Янкоўскага і інш. Працы польскіх лінгвістаў М.Аляхновіча, І.Савіцкай, Э.Смулковай і інш. Пытанне аб прынцыпах беларускага правапісу. Дзейнасць арфаграфічнай камісіі на чале з Якубам Коласам. «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (1959). Пасляваенныя акадэмічныя граматыкі і агульныя курсы сучаснай беларускай літаратурнай мовы: «Граматыка беларускай мовы» ў 2-х т. (1962, 1966), «Беларуская граматыка» ў 2-х т. (1985, 1986), «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы» 1957, 1959, 1960). Манаграфічныя даследаванні М.Булахава, М.Жыдовіч, Ю.Мацкевіч, Д.Лявончанкі, А.Наркевіча, П.Шубы, М.Яўневіча і інш. Дыскусіі аб беларускім правапісе ў канцы ХХ – пачатку ХХІ ст. Зацвярджэнне новай рэдакцыі правілаў беларускага правапісу (2008).

**9.2. Лексікалагічныя і тэрміналагічныя даследаванні сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стст.** Пытанні лексікалогіі ў пасляваенных граматыках сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Калектыўная манаграфія «Лексікалогія беларускай літаратурнай мовы» (1994). Пытанні фарміравання беларускай лексікі ў працах А.Баханькова. Праблемы развіцця і ўдасканалення лексічных сродкаў сучаснай

беларускай літаратурнай мовы ў манаграфічных даследаваннях М.Булахава, М.Крукоўскага. Праблемы ўзаемаадносін беларускай і рускай лексічных сістэм у працах А.Супруна. Стварэнне Тэрміналагічнай камісіі пры АН БССР (1979). Выданне «Беларускай энцыклапедыі» ў 18 т., пяцітомнай «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі», спецыяльных тэрміналагічных слоўнікаў па розных галінах навукі. Манаграфія «Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі» (1999). Аналіз асобных тэрмінасістэм у працах Л.Антанюк, Г.Гваздовіч, І.Германовіча, М.Дабрыян, Д.Дзятко, А.Калечыц, В.Краснея, А.Лапкоўскай і інш.

**10. Дыялекталагічныя і фразеалагічныя даследаванні, культура і гісторыя мовы, сучасныя кірункі даследавання.**

**10.1. Дыялекталагічныя даследаванні ў другой палове XX – пачатку XXI стст.** Стварэнне «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» (1963). Выданне «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» у 5 т. (1993 – 1998). Удзел беларускіх вучоных у падрыхтоўцы «Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа» і «Лінгвістычнага атласа Еўропы». Рэгіянальныя мікраатласы (А.Леванцэвіч, А.Босак, Ю.Чарнякевіч і інш.). Першыя вучэбныя дапаможнікі па беларускай дыялекталогіі. Манаграфіі, прысвечаныя дыялектнай фанетыцы (Т.Вайтовіч, Ф.Клімчук, І.Яшкін і інш.) і граматыцы (Ю.Мацкевіч, С.Прохарава, А.Чабярук і інш.), лексіцы і фразеалогіі (Г.Вештарт, Л.Выгонная, М.Даніловіч, І.Лучыц-Федарэц, В.Старычонак і інш.).

**10.2. Фразеалагічныя даследаванні ў другой палове XX – пачатку XXI стст.** Праблемы станаўлення фразеалогіі як галіны мовазнаўства. Пытанні фразеалагічнай стылістыкі і дыялектнай фразеалогіі ў манаграфіях М.Даніловіча, У.Коваля, І.Лепешава, Ф.Янкоўскага. Фразеалагічныя слоўнікі П.Ахрыменкі і М.Буцько, В.Ліцвінкі і Л.Царанкова і інш. Дзейнасць Ф.Янкоўскага. Выданне «Слоўніка беларускай народнай фразеалогіі» Е.Мяцельскай і Я.Камароўскага, слоўнікаў устойлівых спалучэнняў Г.Юрчанкі. Новыя напрамкі фразеаграфіі. Дзейнасць І.Лепешава, Г.Малажай. Стварэнне перакладных (двухмоўных) фразеалагічных слоўнікаў (А.Аксамітаў і М.Чурак, І.Кісялёў, Л.Корсак і Л.Марціновіч, З.Санько і інш.).

**10.3. Вывучэнне стылістыкі і пытанняў культуры мовы ў другой палове XX – пачатку XXI стст.** Даследаванні па пытаннях культуры мовы М.Абабуркі, Г.Арашонкавай і В.Лемцюговай, А.Каўруса, П.Сцяцко, Р.Шкрабы, У.Юрэвіча, Ф.Янкоўскага, А.Яскевіча і інш. Фарміраванне стылістыкі як асобнай галіны беларускага мовазнаўства. Стварэнне першых вучэбных дапаможнікаў па стылістыцы беларускай мовы. Дзейнасць А.Каўруса, А.Юрэвіч, М.Цікоцкага. Культура маўлення як аб'ект вывучэння. Выданне вучэбных дапаможнікаў І.Лепешава, Т.Тамашэвіча. Праблемы лінгвістычнага аналізу тэксту ў працах І.Лепешава, Г.Малажай і інш. Манаграфічныя даследаванні пра моватворчасць пісьменнікаў (М.Абабурка, А.Адамовіч, А.Каўрус, І.Лепешаў, В.Рагаўцоў, В.Рагойша, Т.Сцяшковіч, Т.Трыпуціна і

інш.). Пашырэнне тэматыкі лінгвастылістычных даследаванняў мастацкіх тэкстаў. Актуальнасць лінгвастылістычных даследаванняў.

**10.4. Вывучэнне гісторыі беларускай мовы ў другой палове XX – – пачатку XXI стст**. Гісторыя часцін мовы ў даследаваннях лінгвістаў (манаграфіі М.Булахава, М.Жыдовіч, Д.Лявончанкі). Вывучэнне марфалагічных катэгорый (А.Груца, І.Крамко, Т.Ясіньска-Соха і інш.). Гісторыя беларускай літаратурнай мовы ў працах А.Булыкі, А.Жураўскага, І.Крамко, У.Свяжынскага, Л.Шакуна, А.Юрэвіч, А.Яновіч і інш. Стварэнне вучэбных дапаможнікаў па беларускай гістарычнай фанетыцы і граматыцы (А.Бірала, М.Булахаў, А.Булыка, П.Вэкслер, А.Жураўскі, Ф.Янкоўскі і інш.). Выданне «Хрэстаматыі па старажытнай беларускай літаратуры» А.Коршунава (Мн., 1959). Перавыданне пісьмовых помнікаў. «Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы» (укл. У.Анічэнка, П.Вярхоў, А.Жураўскі, Я.Рамановіч). Вывучэнне мовы асобных помнікаў старажытнага пісьменства ў працах У.Анічэнкі, А.Булыкі, Н.Вайтовіч, І.Гапоненка, А.Дзядовай, І.Клімава, Б.Лапава, В.Несцяровіча, Н.Памецька, Н.Пераналавай, М.Свістуновай, У.Свяжынскага К.Скурата і інш. Стварэнне вучэбных дапаможнікаў па гісторыі беларускай літаратурнай мовы (А.Жураўскі, Л.Шакун, І.Крамко, А.Юрэвіч, А.Яновіч і інш.).

**10.5. Беларуская мова і мовазнаўства на пачатку XXI ст.** Асноўныя напрамкі сучасных лінгвістычных даследаванняў. Лінгвакультуралагічныя працы беларускіх мовазнаўцаў (В.Маслава, І.Токарава, Л.Чумак і інш.). Сацыяльная лінгвістыка (А.Міхневіч, Н.Мячкоўская У.Свяжынскі, Л.Сямешка і інш.). Камп’ютэрная лінгвістыка (У.Вараб’ёў, А.Дабралюбаў, У.Кошчанка, Б.Плотнікаў, А.Соўпель і інш.). Працы па гісторыі беларускага мовазнаўства (І.Германовіч, А.Жураўскі, М.Прыгодзіч, Т.Тамашэвіч, Л.Шакун і інш.).

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА**
**(дзённая форма атрымання адукацыі)**

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | КСР | | Самастойная праца | | | |
| | | | | Лекцыі | Практ. зан. | | | | |
| | **ГІСТОРЫЯ ЗАМЕЖНАГА І БЕЛАРУСКАГА МОВАЗНАЎСТВА** | **20** | **22** | **2** | **2** | **50** | | | |
| **1.** | **Прадмет і задачы гісторыі замежнага і беларускага мовазнаўства** | **2** | | | | | | | |
| | 1. Прадмет, змест і задачы курса “Гісторыя замежнага і беларускага мовазнаўства”, яе месца ў сістэме філалагічнай адукацыі.<br>2. Асноўныя вучэбныя дапаможнікі па дысцыпліне. Сувязь гісторыі замежнага і айчыннага мовазнаўства з іншымі навукамі.<br>3. Перыядызацыя гісторыі беларускага мовазнаўства. Крыніцы вывучэння гісторыі беларускага мовазнаўства. Бібліяграфіі і агляды прац па беларускім мовазнаўстве. | 2 | | | | | Схема структуры мовазнаў-ства як навукі | [1] | |
| **2.** | **Гістарычныя перадумовы мовазнаўства як навукі.** | **2** | **2** | | | **4** | | | |
| 2.1. | ***Вывучэнне мовы ў старажытныя часы.***<br>1. Мовазнаўства ў старажытнай Індыі. Граматыка Паніні (V ст. да н. э.). Эмпірычнае апісанне ў граматыцы Паніні фанетыкі і марфалогіі санскрыту.<br>2. Мовазнаўства ў старажытнай Грэцыі. Філасофскі перыяд (V – III стст. да н. э.) грэчаскага мовазнаўства (распрацоўка праблем паходжання мовы, прыроды назвы, суадносін мовы і мыслення). Пытанні мовазнаўства ў працах Арыстоцеля (384–322 гг. да н. э.). Уклад стоікаў у распрацоўку граматычных праблем. Александрыйскі, або граматычны, перыяд (III ст. да н. э. – IV ст. н. э.) у вывучэнні мовы..<br>3. Даследаванні александрыйскіх граматыстаў у галіне фанетыкі і граматыкі. Мовазнаўства ў старажытным Рыме. Найважнейшыя працы старажытнарымскіх мовазнаўцаў. Значэнне антычных даследаванняў мовы ў станаўленні мовазнаўства як навукі. | 2 | | | | 2 | Схема развіцця мовазнаў-ства ў Індыі, Грэцыі і Рыме | [1] | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.2. | ***Мовазнаўства ў эпоху Сярэднявечча і Адраджэння.***<br>1. Лінгвістычныя даследаванні ў часы Сярэднявечча (V – XV стст. н. э.). Праблема сутнасці мовы і сутнасці найменняў у сярэднявечнай філасофіі. Пытанне пра паходжанне мовы. Дасягненні арабскага (дзяржава Арабскі Халіфат, VII – XIII стст.) мовазнаўства ў галіне граматыкі і лексікаграфіі.<br>2. Мовазнаўства ў эпоху Адраджэння (XIV – XVII стст.). Станаўленне нацыянальных моў і іх вывучэнне. Першыя славянскія граматыкі, граматыкі Л. Зізанія (1596) і М. Сматрыцкага (1619). «Граматыка агульная і рацыянальная» (1660) А. Арно і К. Лансло.<br>3. Натуралістычныя тэорыі паходжання мовы (выклічнікавая, гукапераймальная, сацыяльнай дамоўленасці) у французскай і нямецкай філасофіі XVIII ст. (Ж. Русо, Д. Дзідро, Г. Лейбніц, І. Гердэр). Лексікаграфічныя працы П. Паласа («Параўнальныя слоўнікі ўсіх моў і народаў», 1787–1789; 2 выд.,1790–1791), Л. Герваса («Каталог моў вядомых народаў...», 1784; 2 выд., 1800–1804), І. Адэлунга і І. Фатэра («Мітрыдат, або Агульнае мовазнаўства», 1806–1817). «Расійская граматыка» (1755) М.Ламаносава. | | 2 | | | 2 | Схема развіцця мовазнаў-ства ў эпоху Сярэднявечча і Адраджэння | [1], дад.: 1, 3–5 | Апытванне, вусныя паведамленні |
| **3.** | **Параўнальна-гістарычнае мовазнаўства.** | **2** | **2** | | | **4** | | | |
| 3.1 | ***Найважнейшыя перадумовы для ўзнікнення параўнальна-гістарычнага мовазнаўства.***<br>1. Росквіт жывых літаратурных моў, стварэнне перакладных слоўнікаў, адкрыццё еўрапейцамі старажытнаіндыйскай мовы санскрыту, практычная работа па напісанні граматык і слоўнікаў розных моў. Спроба І. Скалігера сістэматызаваць усе еўрапейскія мовы ў кн. «Разважанні пра еўрапейскія мовы» (1599). У. Джоунз (1746–1794) пра паходжанне некаторых еўрапейскіх моў (грэчаскай, лацінскай, гоцкай і інш.) і санскрыту з агульнай прамовы.<br>2. Ф.Шлегель (1772–1829) пра роднасць санскрыту з лацінскай, грэчаскай, германскай і персідскай мовамі. Ф.Боп (1791–1867) пра гістарычную роднасць індаеўрапейскіх моў. Р.Раск (1787–1832) пра агульную для еўрапейцаў мову-крыніцу, пра падабенства моў, прынцыпы навуковай этымалогіі слоў і параўнальнага апісання моў.<br>3. «Нямецкая граматыка» (1819–1837) Я.Грыма (1785–1863). А.Вастокаў (1781–1864) пра перыядызацыю развіцця славянскіх і рускай моў, гукавое значэнне насавых галосных, гукавыя працэсы, звязаныя з стратай рэдукаваных, пра першую і другую палаталізацыю, пра лексічныя крытэрыі вызначэння ступені роднасці моў (першасныя і другасныя словы). | 2 | | | | 2 | Прэзента-цыя “Паходжанне еўрапейс-кіх моў” | [1], дад.: дад.: 1, 3–5 | Апытванне, вусныя паведамленні |
| 3.2 | ***Развіццё параўнальна-гістарычнага мовазнаўства (кампаратывістыкі) ў другой палове XIX ст.***<br>1. Значэнне ўзнікнення параўнальна-гістарычнага мовазнаўства. Праўнальна-гістарычнае даследаванне моў у сучасны перыяд.<br>2. В.Гумбальт (1767–1835) як заснавальнік агульнага мовазнаўства. А.Шляйхер (1821–1868) як заснавальнік натуралістычнага кірунку ў лінгвістыцы. Асноўныя тыпы моў паводле марфалагічнай класіфікацыі А.Шляйхера. Стадыянальнасць у развіцці моў. Тэорыя радаслоўнага дрэва індаеўрапейскіх моў.<br>3. Прамова і яе рэканструкцыя. Г.Штайнталь (1823–1899) як заснавальнік псіхалагічнай | | 2 | | | 2 | Даведнік “Языкознание. Большой энциклопедический словарь” | [1], дад.: 1, 3–5 | Індывідуальнае і франтальнае апытванне Тэрміналагічны дыктант |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | школы ў мовазнаўстве. Псіхалагічная трактоўка сутнасці і працэсаў развіцця мовы. | | | | | | | | |
| **4.** | **Младаграматычны кірунак і дзейнасць Ф. дэ Сасюра.** | **2** | **2** | | | **6** | | | |
| 4.1 | ***Младаграматычны кірунак у мовазнаўстве.***<br>1. Младаграматысты пра актуальнасць вывучэння жывых моў, пра найважнейшыя навуковыя прынцыпы вывучэння мовы (псіхалагізм, індывідуалізм, гістарызм, атамізм).<br>2. Вучэнне пра фанетычныя законы і змяненне значэнняў слоў. Роля аналогіі ў развіцці мовы. Роля ідэй младаграматыстаў у развіцці лінгвістычных кірункаў (дыялекталогіі, лінгвагеаграфіі, эстэтызму) і школ.<br>3. Праблемы агульнага мовазнаўства ў працах І.Бадуэна дэ Куртэнэ (1845–1929). Пытанні агульнага мовазнаўства ў працах П.Фартунатава (1848 –1914). | 2 | | | | 4 | Схема развіцця младаграм атычных даследава нняў | [1], дад.: 1, 3–5 | Апытванне, пісьмовыя і вусныя паведамленні |
| 4.2 | ***Ф. дэ Сасюр як заснавальнік сучаснай тэарэтычнай лінгвістыкі.***<br>1. Праблемы агульнага мовазнаўства ў працах Ф. дэ Сасюра. Вызначэнне спецыфікі мовазнаўства як навукі. Адрозненне мовы і маўлення як двух аспектаў маўленчай дзейнасці.<br>2. Знешняя і ўнутраная лінгвістыка, сінхранія і дыяхранія. Сістэмнасць мовы. Сінтагматычныя і асацыяцыйныя (парадыгматычныя) адносіны паміж моўнымі знакамі. Азначальнае (план выражэння) і азначаемае (план зместу) моўнага знака. Значнасць (вартасць) знака. Значнасць і значэнне. Уласцівасці моўнага знака. Адвольнасць (нематываванасць) сувязі азначальнага і азначаемага і абавязковасць знака для мовы.<br>3. Роля Ф. дэ Сасюра ва ўзнікненні сацыяльнай лінгвістыкі і лінгвасеміётыкі. Уплыў ідэй Ф. дэ Сасюра на развіццё сучаснай лінгвістыкі (структуралізму). | | 2 | | | 2 | Схема асноўных навуковых дасягнен-няў Ф. дэ Сасюра | [1], дад.: 1, 3–5 | Рэйтынгавая кантрольная работа№ 1 |
| **5.** | **Развіццё ўсходнеславянскага мовазнаўства ў XX – пачатку XXI ст. і сучасная лінгвістыка.** | **2** | **2** | | | **6** | | | |
| 5.1 | ***Развіццё ўсходнеславянскага мовазнаўства ў XX ст.***<br>1. Праблема суадносін мовы і грамадства ў мовазнаўстве 20–30-х гадоў (Р.Шор, В.Жырмунскі, Л.Якубінскі і інш.). Агульналінгвістычныя погляды Л.Шчэрбы (1880–1944).<br>2. «Новае вучэнне пра мову» М.Мара (1864/65–1934). Агульналінгвістычныя праблемы ў працах Я.Дз.Паліванава (1891–1938).<br>3. Агульналінгвістычныя погляды А.Смірніцкага (1902/03–1954). Тыпалагічная канцэпцыя І.Мешчанінава (1883–1967).<br>4. Агульналінгвістычныя праблемы ў працах В.Вінаградава (1894/95–1969) (граматычнае вучэнне пра слова, лексікалогія і фразеалогія, сінтаксічная тэорыя, моўныя стылі, мова мастацкай літаратуры).<br>5. Уклад усходнеславянскіх лінгвістаў у тэорыю мовазнаўства. | 2 | | | | 2 | Схема лінгвістыч ных праблем усходнес-лавянскіх мовазнаў-цаў | [1], дад.: 1, 3–5 | Апытванне, вусныя паведамленні |
| 5.2. | ***Сучасная лінгвістыка і інтэрлінгвістыка.***<br>1. Мовазнаўства на сучасным этапе (антрапацэнтрычны кірунак, пераарыентацыя з аналізу на сінтэз, пашырэнне колькасна-статыстычных метадаў, лінгвістычная універсалогія, камп’ютэрная лінгвістыка, тэорыя маўленчых актаў і маўленчага ўздзеяння, функцыянальная граматыка, макракампаратывістыка і інш.). | | 2 | | | 4 | Схема напрамкаў сучаснай лінгвісты-кі | [1], дад.: 1, 3–5 | Калёквіум |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Праблемы кагнітыўнай лінгвістыкі. Асноўныя паняцці кагнітыўнай лінгвістыкі. Праблемы камунікатыўнай лінгвістыкі. Праблемы прыкладной лінгвістыкі. Пытанні мадэлявання мовы ў дзеянні. Камп’ютэрная лінгвістыка. Праблемы інфармацыйна-пошукавых аспектаў прыкладной лінгвістыкі.<br>3. Праблемы сацыялінгвістыкі. Мова і грамадства. Праблемы класіфікацыі сацыялінгвістычных фактараў. Сацыялінгвістычныя фактары ў развіцці сістэмы мовы. Сучасная моўная сітуацыя і яе вывучэнне.<br>4. Праблемы псіхалінгвістыкі. Этапы развіцця псіхалінгвістыкі. Кампаратывістыка на мяжы 19 – 20 ст. Праблемы ўнутранай рэканструкцыі.<br>5. Прынцыпы арэальнай (прасторавай) лінгвістыкі ў сучасным параўнальна-гістарычным мовазнаўстве. Праблема праславянскай прарадзімы. | | | | | | | | |
| **6.** | **Гісторыя развіцця беларускага мовазнаўства часоў старажытнасці** | **2** | **2** | | | **4** | | | |
| 6.1 | ***Развіццё граматычнай думкі ва ўсходніх славян.***<br>1. Пераклад і тлумачэнне незразумелых слоў на палях і ў тэксце беларускіх старадрукаў (глосы).<br>2. Францыск Скарына, Васіль Цяпінскі, Сымон Будны, Іван Фёдараў, Мялецій Сматрыцкі і іх мовазнаўчая дзейнасць.<br>. | 2 | | | | 2 | Схема развіцця беларускага мовазнаства старажытнасці | [1], [2], дад.: 2, 5 | Тэсціраванне |
| 6.2 | ***Старажытныя лексікаграфічныя выданні***.<br>1. «Лексіс» Лаўрэнція Зізанія, «Лексікон славенароскі» Памвы Бярынды і інш.. Буквары, граматыкі і іншыя вучэбныя дапаможнікі (І.Фёдараў, С.Собаль, Л.Зізаній, М.Сматрыцкі, І.Ужэвіч).<br>2. Юрый Крыжаніч як даследчык беларускай мовы. | | 2 | | | 2 | Прэзента-цыя “Буквары старажыт насці” | [1], [2], дад.: 2, 5 | Калёквіум |
| **7.** | **Вывучэнне беларускай мовы ў XIX ст.** | **2** | **2** | | | **4** | | | |
| 7.1 | ***Галоўныя кірункі ў даследаванні беларускай мовы першай паловы XIX ст.***<br>1. Адносіны грамадскасці да беларускай мовы. Погляды А.Меера, К.Калайдовіча, Ф.Галатузава, П.Шпілеўскага.<br>2. Першыя працы аб беларускай мове (С.-Б.Ліндэ, К.Калайдовіч, П.Шафарык, І.Грыгаровіч).<br>3. Ян Чачот як даследчык беларускай мовы.<br>4. Беларускі матэрыял у шматмоўным слоўніку Ф.Шымкевіча.<br>5. Уплыў грамадска-палітычных абставін на навуковую распрацоўку беларускай мовы | 2 | | | | 2 | Схема даследаванняў беларус-кай мовы ў XIX ст. | [2], дад.: 2, 5 | Тэсціраванне |
| 7.2 | ***Даследаванне беларускай мовы другой паловы XIX – пачатку XX стст.***<br>1. Роля К.Каліноўскага і Ф.Багушэвіча ў абуджэнні цікавасці да мовы беларускага народа. Этналінгвістычнае апісанне беларусаў. Вывучэнне мясцовых гаворак (П.Шэйн, Е.Раманаў, М.Янчук, М.Доўнар-Запольскі, А.Сержпутоўскі, М.Федароўскі, М.Нікіфароўскі, С.Мікуцкі і інш.).<br>2. Лінгвістычная спадчына І.Насовіча, яго «Слоўнік беларускай мовы» (1870).<br>3. Вывучэнне гісторыі беларускай мовы (А.Патабня, І.Сразнеўскі, Ф.Фартунатаў, | | 2 | | | 2 | Схема даследаванняў беларус-кай мовы ў XIX ст. | [2], дад.: 2, 5 | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | А.Шахматаў, У.Даль, А.Сабалеўскі, Ф.Буслаеў, П.Уладзіміраў, А.Весялоўскі, Я.Будэ, А.Брукнер і інш.).<br>4. Яўхім Карскі – заснавальнік беларускага мовазнаўства. Агульныя звесткі пра навуковую дзейнасць Я.Карскага. Працы Я.Карскага па дыялекталогіі і гісторыі беларускай мовы. «Беларусы» – энцыклапедыя беларусазнаўства. Вывучэнне дыялектнай мовы. «Этнографическая карта белорусского племени» (1903) Я.Карскага. | | | | | | | | |
| **8.** | **Гісторыя даследавання беларускай мовы ў першай палове ХХ ст. (6 г.)** | **2** | **4** | | | **6** | | | |
| 8.1 | ***Распрацоўка беларускай нацыянальнай тэрміналогіі ў першай палове ХХ ст.***<br>1. Беларуская лексікаграфія ў даваенны час. Стварэнне Навукова-тэрміналагічнай камісіі (люты 1921 г.) і Інстытута беларускай культуры (студзень 1922 г.). Выходная база пры стварэнні беларускай навуковай тэрміналогіі і пошукі канцэпцыі яе распрацоўкі.<br>2. Першыя публікацыі Навукова-тэрміналагічнай камісіі. Выданні серыі «Беларуская навуковая тэрміналогія» і іншыя тэрміналагічныя слоўнікі 20-х – пачатку 30-х гадоў.<br>3. Лексікаграфічныя працы братоў М. і Г.Гарэцкіх. М.Байкоў і яго лексікаграфічная дзейнасць. «Беларуска-расійскі слоўнік» 1926 г. і «Расійска-беларускі слоўнік» 1928 г. М.Байкова і С.Некрашэвіча. «Падручны беларуска-польскі слоўнік» Б.Друцкага-Падбярэскага (Вільня, 1929). «Яўрэйска-беларускі слоўнік» С.Плаўніка і Н.Рубінштэйна (1932). «Сямімоўны слоўнік» (Лейпцыг, 1918). «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» В.Ластоўскага. «Руска-беларускі слоўнік» пад рэдакцыяй А.Александровіча (1937). | 2 | | | | 2 | Схема тэрміналагічных даследаванняў у ХХ ст. | [1], дад.: 2, 5 | Вусныя паведамленні па тэме, рэфераты |
| 8.2 | ***Даследаванне фанетыкі і граматыкі беларускай мовы ў першай палове ХХ ст.***<br>1. «Беларуская граматыка для школ» (1918) Б.Тарашкевіча – пачатак унармавання беларускай літаратурнай мовы. Значэнне «Беларускай граматыкі» (1918) Б.Пачобкі і «Зоркі» (1918) А.Смоліча ў школьнай адукацыі. Першыя правапісныя дапаможнікі Я.Лёсіка і праца «Правапіс спрэчных дзеяслоўных форм» С.Некрашэвіча.<br>2. Арфаграфічная дыскусія сярэдзіны 20-х гадоў. Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі 1926 г.<br>3. Рэформа правапісу беларускай мовы 1933 года. Дэкрэт СНК БССР «Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу» ад 26 жніўня 1933 года.<br>4. Першы навуковы курс сучаснай беларускай мовы пад рэдакцыяй Ц.Ломцева (1935 – 1940).<br>5. «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі» В.Ластоўскага. Лінгвістычныя пытанні на старонках часопісаў («Крывіч», «Калоссе», «Шлях моладзі»). | | 2 | | | 2 | Схема фанетычных даследаванняў у ХХ ст. | [1], дад.: 2, 5 | Тэсціраванне |
| 8.3 | ***Дыялекталагічныя, гістарычныя, славістычныя і этымалагічныя даследаванні ў першай палове ХХ ст.***<br>1. Асаблівасці беларускіх гаворак у артыкулах замежных мовазнаўцаў (Г.Ільінскі, М.Коген, Л.Асоўскі, М.Дурнаво, В.Ганцоў, І.Галанаў і інш.). Праграма па вывучэнні беларускіх гаворак Я.Карскага і яго падручнік «Русская диалектология» (1924).<br>2. Дзейнасць П.Растаргуева. Даследаванні беларускіх гаворак С.Некрашэвіча і І.Воўка-Левановіча. «Спроба лінгвістычнае геаграфіі Беларусі» П.Бузука (1928) – адзін з першых | | 2 | | | 2 | Схема славістычных і этымалагічных даследаванняў у ХХ | [1], дад.: 2, 5 | Даклады |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | славянскіх дыялекталагічных атласаў.<br>3. Дыялектная лексікаграфія 20-ых гадоў (М.Каспяровіч, М.Шатэрнік і інш.). «Лекцыі па гісторыі беларускай мовы» (1927) і іншыя працы І.Воўка-Левановіча.<br>4. Даследаванне праблемы паходжання беларускай мовы. Падрыхтоўка да стварэння гістарычнага слоўніка беларускай мовы. Распрацоўка праблем гісторыі беларускай мовы за межамі Беларусі (Х.Станг, А.Мартэль). Леў Цвяткоў як славіст.<br>5. Славістычныя распрацоўкі П.Бузука і І.Воўка-Левановіча. Этымалагічныя даследаванні М.Когена. | | | | | | ст. | | |
| **9.** | **Гісторыя даследавання беларускай мовы ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стст.** | **2** | **2** | | | **6** | | | |
| 9.1 | **Даследаванне фанетыкі і граматыкі беларускай мовы ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стст.**<br>1. Станаўленне на Беларусі эксперыментальнай фанетыкі. Манаграфія А.Падлужнага і В.Чэкмана «Гукі беларускай мовы» (1973). Калектыўная праца «Галосныя гукі беларускай мовы» (1975).<br>2. Навуковая дзейнасць Л.Выгоннай, А.Крывіцкага, А.Падлужнага, В.Чэкмана і інш. Пытанні націску, інтанацыі і іншых фанетычных сродкаў у даследаваннях М.Бірылы, Л.Вардамацкага, Л.Выгоннай і інш. Арфаэпічныя пытанні ў працах М.Бірылы, А.Падлужнага, Ф.Янкоўскага і інш. Працы польскіх лінгвістаў М.Аляхновіча, І.Савіцкай, Э.Смулковай і інш.<br>3. Пытанне аб прынцыпах беларускага правапісу. Дзейнасць арфаграфічнай камісіі на чале з Якубам Коласам. «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (1959). Пасляваенныя акадэмічныя граматыкі і агульныя курсы сучаснай беларускай літаратурнай мовы: «Граматыка беларускай мовы» ў 2-х т. (1962, 1966), «Беларуская граматыка» ў 2-х т. (1985, 1986), «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы» 1957, 1959, 1960).<br>4. Манаграфічныя даследаванні М.Булахава, М.Жыдовіч, Ю.Мацкевіч, Д.Лявончанкі, А.Наркевіча, П.Шубы, М.Яўневіча і інш. Дыскусіі аб беларускім правапісе ў канцы ХХ – пачатку ХХІ ст. Зацвярджэнне новай рэдакцыі правілаў беларускага правапісу (2008). | 2 | | | | 4 | Схема фанетыч-ных даследава нняў у ХХ ст. | [1], дад.: 2, 5 | Вусныя паведамленні па тэме, рэфераты |
| 9.2 | ***Лексікалагічныя і тэрміналагічныя даследаванні сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стст.***<br>1. Пытанні лексікалогіі ў пасляваенных граматыках сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Калектыўная манаграфія «Лексікалогія беларускай літаратурнай мовы» (1994). Пытанні фарміравання беларускай лексікі ў працах А.Баханькова.<br>2. Праблемы развіцця і ўдасканалення лексічных сродкаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў манаграфічных даследаваннях М.Булахава, М.Крукоўскага. Праблемы ўзаемаадносін беларускай і рускай лексічных сістэм у працах А.Супруна.<br>3. Стварэнне Тэрміналагічнай камісіі пры АН БССР (1979). Выданне «Беларускай энцыклапедыі» ў 18 т., пяцітомнай «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі», спецыяльных тэрміналагічных слоўнікаў па розных галінах навукі. Манаграфія «Тэорыя і | | 2 | | | 2 | Схема тэрмінала гічных даследава нняў у ХХ ст. | [1], дад.: 2, 5 | Калёквіум |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | практыка беларускай тэрміналогіі» (1999). 4. Аналіз асобных тэрмінасістэм у працах Л.Антанюк, Г.Гваздовіч, І.Германовіча, М.Дабрыян, Д.Дзятко, А.Калечыц, В.Краснея, А.Лапкоўскай і інш. | | | | | | | | |
| **10.** | **Дыялекталагічныя і фразеалагічныя даследаванні, культура і гісторыя мовы, сучасныя кірункі даследавання.** | **2** | **4** | **2** | **2** | **10** | | | |
| 10.1 | ***Дыялекталагічныя даследаванні ў другой палове XX – пачатку XXI стст.***<br>1. Стварэнне «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» (1963). Выданне «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» у 5 т. (1993 – 1998). Удзел беларускіх вучоных у падрыхтоўцы «Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа» і «Лінгвістычнага атласа Еўропы». Рэгіянальныя мікраатласы (А.Леванцэвіч, А.Босак, Ю.Чарнякевіч і інш.).<br>2. Першыя вучэбныя дапаможнікі па беларускай дыялекталогіі. Манаграфіі, прысвечаныя дыялектнай фанетыцы (Т.Вайтовіч, Ф.Клімчук, І.Яшкін і інш.) і граматыцы (Ю.Мацкевіч, С.Прохарава, А.Чабярук і інш.), лексіцы і фразеалогіі (Г.Вештарт, Л.Выгонная, М.Даніловіч, І.Лучыц-Федарэц, В.Старычонак і інш.). | 2 | | | | 2 | Схема дыялекта-лагічных даследава нняў у XX ст. | [1], дад.: 2, 5 | Вусныя паведамленні па тэме, рэфераты |
| 10.2 | ***Фразеалагічныя даследаванні ў другой палове XX – пачатку XXI стст.***<br>1.Праблемы станаўлення фразеалогіі як галіны мовазнаўства. Пытанні фразеалагічнай стылістыкі і дыялектнай фразеалогіі ў манаграфіях М.Даніловіча, У.Коваля, І.Лепешава, Ф.Янкоўскага.<br>2. Фразеалагічныя слоўнікі П.Ахрыменкі і М.Буцько, В.Ліцвінкі і Л.Царанкова і інш. Дзейнасць Ф.Янкоўскага. Выданне «Слоўніка беларускай народнай фразеалогіі» Е.Мяцельскай і Я.Камароўскага, слоўнікаў устойлівых спалучэнняў Г.Юрчанкі.<br>3. Новыя напрамкі фразеаграфіі. Дзейнасць І.Лепешава, Г.Малажай. Стварэнне перакладных (двухмоўных) фразеалагічных слоўнікаў (А.Аксамітаў і М.Чурак, І.Кісялёў, З.Санько і інш.). | | 2 | | | 2 | Схема дыялекта-лагічных даследава нняў у XX ст. | [1], дад.: 2, 5 | Даклады |
| 10.3 | ***Вывучэнне стылістыкі і пытанняў культуры мовы ў другой палове XX – пачатку XXI стст.***<br>1. Даследаванні па пытаннях культуры мовы М.Абабуркі, Г.Арашонкавай і В.Лемцюговай, А.Каўруса, П.Сцяцко, Р.Шкрабы, У.Юрэвіча, Ф.Янкоўскага, А.Яскевіча і інш. Фарміраванне стылістыкі як асобнай галіны беларускага мовазнаўства. Стварэнне першых вучэбных дапаможнікаў па стылістыцы беларускай мовы. Дзейнасць А.Каўруса, А.Юрэвіч, М.Цікоцкага.<br>2. Культура маўлення як аб'ект вывучэння. Выданне вучэбных дапаможнікаў І.Лепешава, Т.Тамашэвіча.<br>3. Праблемы лінгвістычнага аналізу тэксту ў працах І.Лепешава, Г.Малажай і інш. Манаграфічныя даследаванні пра моватворчасць пісьменнікаў (М.Абабурка, А.Адамовіч, А.Каўрус, І.Лепешаў, В.Рагаўцоў, В.Рагойша, Т.Сцяшковіч, Т.Трыпуціна і інш.).<br>4. Пашырэнне тэматыкі лінгвастылістычных даследаванняў мастацкіх тэкстаў. Актуальнасць лінгвастылістычных даследаванняў. | | 2 | | | 2 | Схема даследаван-няў культуры беларускай мовы ў XX ст. | [1] | |
| 10.4 | ***Вывучэнне гісторыі беларускай мовы ў другой палове XX – пачатку XXI стст.***<br>1. Гісторыя часцін мовы ў даследаваннях лінгвістаў (манаграфіі М.Булахава, М.Жыдовіч, | | | 2 | | 2 | Схема даследава | [1], | Даклады |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Д.Лявончанкі). Вывучэнне марфалагічных катэгорый (А.Груца, І.Крамко, Т.Ясіньска-Соха і інш.).<br>2. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы ў працах А.Булыкі, А.Жураўскага, І.Крамко, У.Свяжынскага, Л.Шакуна, А.Юрэвіч, А.Яновіч і інш. Стварэнне вучэбных дапаможнікаў па беларускай гістарычнай фанетыцы і граматыцы (А.Бірала, М.Булахаў, А.Булыка, П.Вэкслер, А.Жураўскі, Ф.Янкоўскі і інш.).<br>3. Выданне «Хрэстаматыі па старажытнай беларускай літаратуры» А.Коршунава (Мн., 1959). Перавыданне пісьмовых помнікаў. «Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы» (укл. У.Анічэнка, П.Вярхоў, А.Жураўскі, Я.Рамановіч). Вывучэнне мовы асобных помнікаў старажытнага пісьменства ў працах У.Анічэнкі, А.Булыкі, Н.Вайтовіч, І.Гапоненка, А.Дзядовай, І.Клімава, Б.Лапава, В.Несцяровіча, Н.Памецька, Н.Перавалавай, М.Свістуновай, У.Свяжынскага К.Скурата і інш.<br>4. Стварэнне вучэбных дапаможнікаў па гісторыі беларускай літаратурнай мовы (А.Жураўскі, Л.Шакун, І.Крамко, А.Юрэвіч, А.Яновіч і інш.). | | | | | | нняў гісторыі беларуская й мовы ў ХХ ст. | дад.: 2, 5 | |
| 10.5 | ***Беларуская мова і мовазнаўства на пачатку XXI ст.***<br>1. Асноўныя напрамкі сучасных лінгвістычных даследаванняў. Лінгвакультуралагічныя працы беларускіх мовазнаўцаў (В.Маслава, І.Токарава, Л.Чумак і інш.).<br>2. Сацыяльная лінгвістыка (А.Міхневіч, Н.Мячкоўская У.Свяжынскі, Л.Сямешка і інш.).<br>3. Камп’ютэрная лінгвістыка (У.Вараб’ёў, А.Дабралюбаў, У.Кошчанка, Б.Плотнікаў, А.Соўпель і інш.).<br>4. Працы па гісторыі беларускага мовазнаўства (І.Германовіч, А.Жураўскі, М.Прыгодзіч, Т.Тамашэвіч, Л.Шакун і інш.). | | | | 2 | 2 | Прэзентацыя “Сучасныя даследаванні беларускай мовы” | [1], дад.: 2, 5 | Даклады |
| | ***Усяго:*** | **20** | **22** | **2** | **2** | **50** | | | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Гируцкий, А. А. Общее языкознание : учеб. пособие / А. А. Гируцкий. – Минск : Выш. шк., 2017. – 237 с.
2. Запрудскі, С. М. Нарысы гісторыі беларускага мовазнаўства XIX стагоддзя : вучэб. дапам. / С. М. Запрудскі ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск : БДУ, 2020. – 193 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Аплатов, В. М. Языкознание: от Аристотеля до компьютерной лингвистки / В. М. Аплатов. – М. : Альпина нон-фикшн, 2018. – 252 с.
2. Дзятко, Д. В. Нарысы па гісторыі беларускай лінгвістыкі / Д. В. Дзятко, П. А. Міхайлаў. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. – 495 с.
3. Калюта, А. М. Введение в языкознание : учеб.-метод. пособие / А. М. Калюта, Л. А. Козловская ; Белорус. гос. ун-т. – Минск : БГУ, 2020. – 100 с.
4. Рогалев, А. Ф. Общее языкознание. Концепции языка : практ. пособие / А. Ф. Рогалев ; Гомел. гос. ун-т. – Гомель : ГГУ, 2021. – 45 с.
5. Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэб. дапам. / Д. В. Дзятко [і інш.] ; пад рэд. Д. В. Дзятко. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 2020. – 588 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Адной з галоўных задач, якія стаяць перад вышэйшай школай, з'яўляецца павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Будучы выпускнік павінен не толькі атрымліваць веды па прадметах, якія прадугледжаны вучэбнымі праграмамі, авалодаць уменнямі і навыкамі выкарыстання гэтых ведаў, метадамі даследчай работы, але і ўмець самастойна набыць новыя навуковыя звесткі.

Сістэматычна арганізаваная самастойная работа студэнтаў з'яўляецца асноўным сродкам падрыхтоўкі да самастойнай дзейнасці, а змест, метады, формы выступаюць у ролі фактараў, якія ўплываюць на даную падрыхтоўку.

Арганізацыя кіруемай самастойнай работы студэнтаў накіравана на вырашэнне наступных **задач**:

– паўтарэнне, замацаванне і абагульненне раней атрыманых ведаў;

– удасканаленне прадметных навыкаў, фарміраванне даследчых уменняў і навыкаў;

– актывізацыя вучэбнай і навукова-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў;

– фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі.

**Крыніцай інфармацыі** пры выкананні студэнтамі кіруемай самастойнай работы могуць выступаць: канспект; друкаваныя матэрыялы; падручнікі і слоўнікі; матэрыялы на электронных носьбітах.

**План кіруемай самастойнай работы** прадугледжвае: форму работы, змест (аб'ём) работы, тэрмін выканання, віды кантролю.

У залежнасці ад **месца і часу правядзення** КСР, характару кіраўніцтва ёю з боку выкладчыка і спосабу кантролю за яе вынікамі падзяляецца на наступныя віды:

– самастойную працу падчас асноўных аўдыторных заняткаў (лекцый, семінараў);

– самастойную працу пад кантролем выкладчыка ў форме планавых кансультацый, творчых кантактаў, залікаў і экзаменаў;

– пазааўдыторную самастойную працу пры выкананні студэнтам дамашніх заданняў навучальнага і творчага характару.

Самастойнасць пералічаных вышэй відаў прац досыць умоўная, і ў рэальным адукацыйным працэсе гэтыя віды перасякаюцца адзін з адным.

Самастойная праца студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі дастаткова разнастайная, яна **можа прадугледжваць**:

– выкананне самастойных прац;

– выкананне кантрольных прац, складанне схем, табліц;

– працу з даведачнай, метадычнай і навуковай літаратурай па мовазнаўстве;

– абарону выкананых прац;

– падрыхтоўку да дыскусій, канферэнцый;

– падрыхтоўку да тэсціравання і інш.

Асноўныя **віды заданняў** для кіруемай самастойнай працы:

– вывучэнне навуковых і вучэбных тэкстаў (падручнікі, першакрыніцы, дадатковая літаратура);

– складанне плану тэксту;

– графічнае адлюстраванне структуры тэксту;

– канспектаванне тэксту;

– выпіскі з тэксту;

– праца са слоўнікамі, даведнікамі; азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі;

– вучэбна-даследчыцкая дзейнасць;

– выкарыстанне аўдыа- і відэазапісаў.

Для **замацавання і сістэматызацыі ведаў**, набытых студэнтамі самастойна, выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– праца з канспектам лекцыі (апрацоўка тэксту), паўторная работа над вучэбным матэрыялам (з падручнікаў, першакрыніц, дадатковай літаратуры і інш.);

– складанне планаў і тэзісаў адказаў;

– складанне табліц для сістэматызацыі навучальнага матэрыялу;

– вывучэнне нарматыўных матэрыялаў;

– адказы на кантрольныя пытанні;

– падрыхтоўка паведамленняў да выступлення на семінары, канферэнцыі;

– падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў;

– складанне бібліяграфіі і інш.;

Для **фарміравання ўменняў** выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– выкананне практыкаванняў па ўзоры;

– рашэнне варыянтных заданняў і практыкаванняў;

– выкананне схем, табліц і пад.;

– рэфлексіўны аналіз прафесійных уменняў з выкарыстаннем аўдыё- і відэатэхнікі і інш.

Віды заданняў для кіруемай самастойнай працы, іх змест і характар могуць мець варыятыўны і дыферэнцыяваны характар, улічваць спецыфіку матэрыялу, які выносіцца на самастойнае вывучэнне.

Сярод **канкрэтных відаў** самастойнай работы рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя:

а) самастойная работа па ўзоры (перанос вядомага спосабу ў аналагічную сітуацыю). Пазнаваўчая дзейнасць студэнтаў пры выкананні гэтых заданняў выяўляецца ў асэнсаванні, запамінанні і ўзнаўленні вучэбнага матэрыялу і прымяненні яго па ўзоры. Яе асноўная мэта – замацаванне ведаў, фарміраванне ўменняў і навыкаў.

б) рэканструктыўна-варыятыўная самастойная работа (перанос вядомага спосаба з некаторай мадыфікацыяй у незнаёмую сітуацыю). На гэтым узроўні студэнт прымяняе вядомы спосаб, адаптуючы яго да новай сітуацыі.

в) эўрыстычная самастойная работа (перанос вядомых спосабаў у нестандартную сітуацыю). Пры гэтым студэнт самастойна выбірае, якія рысы ён можа вылучыць, у якой паслядоўнасці іх падаць і на якія акцэнтаваць асаблівую ўвагу. Дзякуючы гэтаму, самастойная работа набывае даследчы характар.

Для правядзення **кантролю** самастойнай працы студэнтаў выкарыстоўваюцца:

– праверка індывідуальных заданняў;

– семінарскія заняткі;

– калёквіумы;

– канферэнцыі;

– залікі па тэмах, па раздзелах;

– тэсціраванне;

– кантрольныя работы;

– вусны і пісьмовы экзамены.

Для кантролю эфектыўнасці арганізацыі самастойнай працы студэнтаў можна праводзіць анкетаванне, падчас якога выяўляць карыснасць тых ці іншых відаў і арганізацыйных формаў самастойных прац, правільнасць і своечасовасць іх уключэння ў навучальны працэс, дастатковасць метадычнага забеспячэння, адпаведнасць запланаванага часу на іх выкананне і г.д.

**Крытэрыямі адзнакі** вынікаў самастойнай працы студэнта могуць з'яўляцца:

– узровень засваення студэнтам вучэбнага матэрыялу;

– уменне студэнта выкарыстоўваць тэарэтычныя веды пры выкананні практычных задач;

– абгрунтаванасць і выразнасць выкладу адказу;

– афармленне матэрыялу ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандартаў;

– сфарміраваныя ўменні і навыкі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі вывучэння дысцыпліны.

Самастойная работа студэнтаў можа быць паспяховай толькі ў выпадку яе правільнай арганізацыі, неабходнага метадычнага суправаджэння, дзейснага кантролю, абавязковай сістэматызацыі, а пры неабходнасці і карэкціроўкі ведаў, атрыманых студэнтамі самастойна.

Важным змястоўным элементам самастойнай работы з’яўляецца работа студэнтаў над памылкамі, дапушчанымі пры выкананні запланаванай работы. Выкладчык толькі падкрэслівае словы і выразы, у якіх назіраецца памылковае напісанне ці ўжыванне, даючы студэнту магчымасць разабрацца з імі самастойна, г.з. зрабіць гэтыя недахопы аб’ектамі свядомай мэтанакіраванай работы.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Для павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў-філолагаў мэтазгодна на працягу ўсяго тэрміну навучання ў ВНУ прыцягваць кожнага студэнта да сістэматычнай самастойнай работы. Змест і формы самастойнай работы студэнтаў распрацоўваюцца супрацоўнікамі кафедры ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі адукацыйнага стандарту.

Матэрыял, рэкамендаваны для самастойнага вывучэння, студэнты павінны атрымліваць ад выкладчыка з першых тыдняў семестра. Матэрыял для самастойнай працы, распрацаваны выкладчыкамі кафедры, можа ўключаць комплексы індывідуальных заданняў па пэўных тэмах, сістэму індывідуальных дамашніх кантрольных работ па тэмах і раздзелах дысцыпліны.

Эфектыўнасць самастойнай працы студэнтаў залежыць ад многіх фактараў. Тут і аптымальны выбраная форма працы, і дакладныя, канкрэтныя ўказанні і рэкамендацыі выкладчыка з наступнай аб’ектыўнай ацэнкай яе вынікаў і, самае важнае, сістэматычнасць і паслядоўнасць у правядзенні такой працы.

Тэксты для самастойнага чытання і вывучэння, канспектавання і рэферыравання, метадычныя ўказанні па напісанні рэферата, кантрольныя тэсты і заданні для самастойнай працы студэнтаў ёсць у кнізе: Запрудскі, С. М. Нарысы гісторыі беларускага мовазнаўства XIX стагоддзя : вучэб. дапаможнік / С. М. Запрудскі ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск : БДУ, 2020. – 193 с.

| Модуль | Тэксты для самаст. чытання і вывучэння | Кантрольныя тэксты | Заданні для самаст. работы |
|---|---|---|---|
| Модуль 1. Прадмет і задачы гісторыі беларускага мовазнаўства | Стр. 11-31, 36-50 | Стр. 51-57 | Стр. 58-60 |
| Модуль 2. Гісторыя беларускага мовазнаўства 1 паловы XIX стагоддзя | Стр. 72-88, 97-112, 125-145 | Стр. 146-152 | Стр. 161-163 |
| Модуль 3. Гісторыя беларускага мовазнаўства 2 паловы XIX стагоддзя | Стр. 157-172, 166-176 | Стр. 178-184 | Стр. 186-188 |

У дапаможніку прадстаўлены тэмы рэфератаў да кожнага практычнага занятку, а таксама падаюцца тэксты для канспектавання і рэфірыравання.

# ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

## *Кіруемая самастойная работа № 1*

***Тэма 4.1.*** Младаграматычны кірунак у мовазнаўстве.

**Заданне.**

**І узровень.** Складзіце план адказаў на наступныя пытанні:

1. Калі зарадзіўся младаграматычны кірунак ў еўрапейскім мовазнаўстве?
2. Адзначце некаторыя недахопы папярэдняга мовазнаўства з пункту погляду младаграматыкаў.

**ІІ узровень.** Падрыхтуйце даклады на наступныя тэмы.

1. Мовазнаўчыя прынцыпы младаграматыкаў.
2. Дыялекталогія – асноўны раздзел мовазнаўства, звязаны з младаграматыкамі.
3. Прынцыпы Казанскай лінгвістычнай школы.

**ІІІ узровень. Падрыхтуйце прэзентацыі на тэмы:**

1. Асноўныя працы Бадуэна дэ Куртэнэ.
2. Агульнапрызнаныя тэорыі фанемы, створаныя І.А.Бадуэн дэ Куртэнэ.
3. Падзел фанетыкі І.А.Бадуэн дэ Куртэнэ: раздзелы, падраздзелы, асноўныя паняцці.

## *Кіруемая самастойная работа № 2*

***Тэма 10.1.*** Дыялекталагічныя даследаванні ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стст.

**Заданне.**

**І узровень.** Складзіце план адказаў на наступныя пытанні:

1. Дыялектная аснова мовы вучняў і засваенне нормаў літаратурнай мовы.
2. Патрабаванні школьных праграм да культуры вуснай і пісьмовай мовы вучняў.

**ІІ узровень.** Падрыхтуйце даклады на наступныя тэмы.

1. Выяўленне і класіфікацыя дыялектных адхіленняў у вуснай і пісьмовай мове.
2. Аналіз памылак, звязаных з уплывам роднай гаворкі.
3. Супастаўленне дыялектных з’яў з адпаведнымі з’явамі літаратурнай мовы.
4. Папярэджанне дыялектных памылак.

**ІІІ узровень. Падрыхтуйце прэзентацыі на тэмы:**

1. Арганізацыя ў кабінеце беларускай мовы кутка “Родная гаворка”
2. Збор дыялектнага матэрыялу ў палявых умовах.
3. Дыялектныя лексікаграфічныя працы другой паловы ХХ стагоддзя.
4. Дыялектныя фразеалагічныя працы другой паловы ХХ стагоддзя.

# ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|
| 2.1. | Вывучэнне мовы ў старажытныя часы. | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 2.2. | Мовазнаўства ў эпоху Сярэднявечча і Адраджэння. | Падрыхтаваць даклад па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Вусная |
| 3.1. | Найважнейшыя перадумовы для ўзнікнення параўнальна-гістарычнага мовазнаўства. | Падрыхтаваць даклад па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Вусная |
| 3.2. | Развіццё параўнальна-гістарычнага мовазнаўства (кампаратывістыкі) ў другой палове XIX ст. | Скласці канспект па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 4.1. | Младаграматычны кірунак у мовазнаўстве. | Скласці канспект (рэпазіторый) | Пісьмовая |
| 4.2. | Ф. дэ Сасюр як заснавальнік сучаснай тэарэтычнай лінгвістыкі. | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 5.1. | Развіццё ўсходнеславянскага мовазнаўства ў XX ст. | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 5.2. | Сучасная лінгвістыка і інтэрлінгвістыка. | Падрыхтоўка прэзентацый на тэму (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Вусная |
| 6. 1. | Развіццё граматычнай думкі ва ўсходніх славян. | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 6.2. | Старажытныя лексікаграфічныя выданні. | Выкананне практыкавання або рэферат (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 7.1. | Галоўныя кірункі ў даследаванні беларускай мовы першай паловы XIX ст. | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 7.2. | Даследаванне беларускай мовы другой паловы XIX – пачатку XX стст | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 8.1. | Распрацоўка беларускай нацыянальнай тэрміналогіі ў першай палове XX ст. | Падрыхтаваць даклад па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Вусная |
| 8.2. | Даследаванне фанетыкі і граматыкі беларускай мовы ў першай палове XX ст | Падрыхтаваць даклад па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Вусная |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 8.3. | Дыялекталагічныя, гістарычныя, славістычныя і этымалагічныя даследаванні ў першай палове ХХ ст. | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 9.1. | Даследаванне фанетыкі і граматыкі беларускай мовы ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стст | Падрыхтаваць даклад па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Вусная |
| 9.2. | Лексікалагічныя і тэрміналагічныя даследаванні сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стст | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 10.1. | Дыялекталагічныя даследаванні ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стст | Падрыхтаваць даклад па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Вусная |
| 10.2. | Фразеалагічныя даследаванні ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стст | Падрыхтаваць даклад па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Вусная |
| 10.3. | Вывучэнне стылістыкі і пытанняў культуры мовы ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стст. | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 10.4. | Вывучэнне гісторыі беларускай мовы ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стст. | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 10.5. | Беларуская мова і мовазнаўства на пачатку ХХІ ст. | Падрыхтоўка прэзентацый на тэму (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Вусная |

# ЗАДАННІ ДА РЭЙТЫНГАВЫХ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ

## Кантрольная работа № 1

1. Якія найбольш важныя задачы паўсталі перад мовазнаўствам у 15 – 17 ст.?
2. Пералічыце характэрыя асаблівасці перыяду ранняга сярэднявечча ў развіцці мовазнаўства.
3. Па-якой прычыне працу А.Арно і К.Лансло “Усеагульная і рацыянальная граматыка” часам называюць “Граматыка Пор-Раяля”?
4. Што такое параўнальна-гістарычны метад? Якая яго роля ў мовазнаўстве?
5. Сінонімам да тэрміна “параўнальна-гістарычнае мовазнаўства” з’яўляецца…
6. Як вы разумееце значэнне слова “агульная” ў назве працы А.Арно і К.Лансло “Усеагульная і рацыянальная граматыка” (1660)?
7. Чаму граматыка А.Арно і К.Лансло называецца “рацыянальнай”?Пералічыце характэрыя асаблівасці перыяду позняга сярэднявечча ў развіцці мовазнаўства.
8. У дачыненні да працы А.Арно і К.Лансло “Усеагульная і рацыянальная граматыка”, пабудуйце лагічны рад з наступных паняццяў: лагічная катэгорыя суджэння, звязка, прэдыкат, універсальнасць, універсаліі моўныя.
9. К.Арно і А.Арно лічылі, што любы сказ павінен выражаць суджэнне. Зыходзячы з гэтага адкажыце на пытанне: якія тыпы сказаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы не атрымалі б асвятлення ва “Усеагульнай і рацыянальнай граматыцы”. Меркаванне абгрунтуйце.
10. Ацаніце ролю параўнальна-гістарычнага мовазнаўства ў гісторыі лінгвістыкі.

## Кантрольная работа № 2

1. Назавіце асноўную мэту выкладання дысцыпліны “Беларускае мовазнаўства”.
2. Якія фактары ўлічваюцца пры стварэнні перыядызацыі гісторыі беларускага мовазнаўства?
3. Якія храналагічныя перыяды вылучаюцца ў гісторыі беларускага мовазнаўства?
4. На якія падраздзелы падзяляецца апошні з перыядаў гісторыі беларускага мовазнаўства?
5. У які з гэтых падраздзелаў апошняга з перыядаў гісторыі беларускага мовазнаўства адбывалася панаванне мадыфікаванага антыпурызму? (назваць часавыя межы)
6. Хто з’яўляецца пачынальнікам апрацоўкі беларускай навуковай мовазнаўчай тэрміналогіі?
7. Як называлася мовазнаўчае выданне, выдадзенае Зоськай Верас у 1924 годзе?
8. Назавіце найбольш яркае лінгвістычнае дасягненне заснавальніка кафедры беларускага мовазнаўства БДПУ імя М. Танка Пятра Бузука.
9. Якая штучная мова, нароўні з эсперанта, была распаўсюджана ў свеце ў канцы 19 стагоддзя?
10. Хто з’яўляецца стваральнікам гэтай штучнай мовы – канкурэнта эсперанта?

# ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для атрымання аб’ектыўнай інфармацыі аб ўзроўні паспяховасці студэнтаў мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю ўжываецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

Дыягностыка кампетэнцый па дысцыпліне можа мець розныя формы.

Вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках, калёквіумы, даклады, вусны аналіз дыялектнага тэксту, вусны залік.

Пісьмовы кантроль: тэрміналагічныя дыктанты, кантрольныя работы, пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях, рэфераты, пісьмовы аналіз тэксту гаворкі, пісьмовы залік.

Тэставы кантроль: выкананне тэставых заданняў адкрытага і закрытага тыпу.

## Пералік прыкладных пытанняў да экзамену па дысцыпліне “Гісторыя замежнага і беларускага мовазнаўства”

1. Прадмет і задачы гісторыі замежнага і беларускага мовазнаўства.
2. Перыядызацыя гісторыі замежнага і беларускага мовазнаўства.
3. Індыйская лінгвістычная традыцыя (агульная характарыстыка).
4. Кітайская лінгвістычная традыцыя (агульная характарыстыка).
5. Арабская лінгвістычная традыцыя (агульная характарыстыка).
6. Японская лінгвістычная традыцыя (агульная характарыстыка).
7. Еўрапейская лінгвістычная традыцыя (агульная характарыстыка, асноўныя перыяды).
8. Старажытнагрэчаскае мовазнаўства (агульная характарыстыка). Стаіцызм, дасягненні Александрыйскай школы.
9. Старажытнарымскае мовазнаўства (агульная характарыстыка).
10. Мовазнаўства Сярэднявечча, яго асноўныя праблемы.
11. Мовазнаўства Новага часу (асноўныя задачы).
12. Усеагульная рацыянальная граматыка “Граматыка Пор-Раяля”.
13. Узнікненне параўнальна-гістарычнага мовазнаўства. Першы перыяд кампаратывістыкі. Лінгвістычныя канцэпцыі Ф.Бопа, Р.Раска
14. Першы перыяд кампаратывістыкі. Лінгвістычныя погляды А.Шляйхера, Я.Грыма, А.Х.Вастокава. Другі і трэці перыяды кампаратывістыкі
15. Узнікненне агульнага мовазнаўства. Лінгвістычная канцэпцыя В.Гумбальта.
16. Лагічны кірунак у мовазнаўстве. Псіхалагічны кірунак у мовазнаўстве. Лінгвістычныя погляды Г.Штайнталя.
17. Псіхалагічны кірунак у мовазнаўстве. Лінгвістычныя погляды В.Вунта, А.А.Патабні.
18. Младаграматызм як лінгвістычны кірунак. Крытыка младаграматызму. Лінгвістычныя канцэпцыі Г.Шухарта, К.Фослера.
19. Маскоўская лінгвістычная школа. Навуковая канцэпцыя Ф.Ф.Фартунатава. Казанская лінгвістычная школа. Лінгвістычныя погляды І.А.Бадуэна дэ Куртэнэ. Мовазнаўчая дзейнасць М.В.Крушэўскага і В.А.Багародзіцкага.
20. Пецярбургская лінгвістычная школа (Л.У.Шчэрба, В.У.Вінаградаў, Я.Д.Паліванаў). “Новае вучэнне аб мове” М.Я.Мара і яго крытыка.
21. Лінгвістычная тэорыя Ф. дэ Сасюра, яе ўплыў на сучаснае мовазнаўства.
22. Структуралізм у мовазнаўстве (агульная характарыстыка).
23. Функцыянальная лінгвістыка (Пражская лінгвістычная школа).
24. Дэскрыптыўная лінгвістыка (амерыканскі структуралізм).
25. Гласематыка (Капенгагенскі структуралізм).
26. Крыніцы вывучэння гісторыі беларускага мовазнаўства.
27. Зараджэнне граматычнай думкі ва ўсходніх славян. Развіццё

граматычнай думкі ва ўсходніх славян старажытнай пары.

28. Старажытныя лексікаграфічныя працы.
29. Буквары, граматыкі і іншыя старажытныя вучэбныя дапаможнікі.
30. Першыя працы, прысвечаныя новай беларускай мове.
31. Распрацоўка праблем беларускай мовы ў другой палове XIX ст.
32. Вывучэнне мясцовых гаворак у другой палове XIX ст.
33. Навуковая дзейнасць І.І.Насовіча.
34. Вывучэнне гісторыі беларускай мовы ў другой палове XIX ст.
35. Распрацоўка агульных пытанняў беларускага мовазнаўства ў пачатку XX ст.
36. Вывучэнне дыялектнай мовы ў пачатку XX ст.
37. Вывучэнне гісторыі беларускай мовы ў пачатку XX ст.
38. Навуковая дзейнасць Я.Ф.Карскага.
39. “Беларусы” Я.Ф.Карскага.
40. Распрацоўка правапісу і граматычных нормаў беларускай літаратурнай мовы ў першай палове XX ст.
41. Развіццё беларускага мовазнаўства ў першай палове XX ст. (агульная характарыстыка).
42. Беларускія граматыкі 1910-х – 1920-х гг.
43. “Беларуская граматыка для школ” Б.А.Тарашкевіча.
44. Беларуская лексікаграфія ў першай палове XX ст.
45. Рэформа правапісу 1933 г.
46. Распрацоўка праблем беларускага правапісу ў другой палове XX ст.
47. Пасляваенныя акадэмічныя граматыкі і агульныя курсы беларускай мовы.
48. Вывучэнне фанетыкі беларускай мовы ў XX ст.
49. Вывучэнне словаўтварэння беларускай мовы ў XX ст.
50. Вывучэнне марфалогіі беларускай мовы ў XX ст.
51. Вывучэнне сінтаксісу беларускай мовы ў XX ст.
52. Вывучэнне лексікалогіі беларускай мовы ў XX ст.
53. Вывучэнне фразеалогіі беларускай мовы ў XX ст.
54. Беларуская лексікаграфія ў другой палове XX ст.
55. Вывучэнне праблем стылістыкі і культуры маўлення ў другой палове XX ст.
56. Беларуская дыялекталогія ў другой палове XX ст.
57. Вывучэнне праблем гісторыі мовы ў другой палове XX ст.
58. Вядучыя беларускія лінгвісты (Ф.Янкоўскі, М.Яўневіч, П.Міхайлаў, Н.Вайтовіч, П.Бузук) і інш.
59. Сучасныя падручнікі і дапаможнікі па беларускай мове.
60. Беларускае мовазнаўства на сучасным этапе: школы, кірункі, прыярытэтныя даследаванні.

# КРЫТЭРЫІ І ПАКАЗЧЫКІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ НА ЭКЗАМЕНЕ

| Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|
| **10** | Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам і паказвае яго поўнае разуменне; выяўляе самы высокі ўзровень усвядомленасці вывучанага, абгрунтавана выкладае свае думкі, выкарыстоўваючы звесткі з дадатковай літаратуры, робіць самастойныя вывады і заключэнні, падмацоўвае свой адказ уласнымі ілюстрацыямі-доказамі. Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Перадае матэрыял паслядоўна, захоўваючы нормы літаратуранай  мовы; праяўляе адказнасць, пазнавальную актыўнасць і крэатыўнасць. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **9** | Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам, дае поўнае азначэнне лінгвістычным паняццям, выяўляе высокі ўзровень усвядомленасці вывучанага і ўменне аргументавана выкладаць яго, падмацоўвае свой адказ яркімі ілюстрацыямі-доказамі (як з дапаможнікаў, так і самастойна падабранымі). Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **8** | Студэнт у дастаткова поўным аб'ёме валодае вучэбным матэрыялам, самастойна абгрунтоўвае свой адказ і прыводзіць ілюстрацыі-доказы, узятыя з дапаможнікаў ці лекцый. Пры выкананні аналізу моўных фактаў дапускае асобныя недакладнасці, якія сам жа выпраўляе. Матэрыял выкладае паслядоўна, з захаваннем літаратурных нормаў; не дапускае  фактычных памылак. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **7** | Студэнт у дастаткова поўным аб'ёме перадае вучэбны матэрыял з асобнымі недакладнасцямі, якія выпраўляе пасля дадатковых пытанняў; можа абгрунтаваць свой адказ, прывесці ілюстрацыі-доказы; матэрыял выкладае паслядоўна з нязначнымі адхіленнямі ад літаратурнай нормы. Аналіз моўных фактаў выкананы з некаторымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **6** | Студэнт перадае вучэбны матэрыял з нязначнымі памылкамі, але выпраўляе іх з дапамогай выкладчыка; тэарэтычныя звесткі падмацоўвае ілюстрацыямі, але без дастаткова глыбокага і доказнага іх абгрунтавання; дапускае недакладнасці ў паслядоўнасці выкладу матэрыялу і яго моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з нязначнымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **5** | Студэнт ў асноўным ведае і разумее галоўныя палажэнні тэмы, але дапускае памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, якія можа выправіць з дапамогай выкладчыка; выкладае матэрыял непаслядоўна; дапускае памылкі |

| | |
|---|---|
| | ў моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з памылкамі, якія выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае. |
| **4** | Студэнт няпоўна выкладае праграмны вучэбны матэрыял, дапускае асобныя памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, не ўмее абгрунтаваць свае разважанні, адчувае цяжкасці пры падборы ілюстрацый; парушае паслядоўнасць выкладу матэрыялу, дапускае памылкі ў моўным афармленні адказу. Моўны аналіз выкананы з памылкамі, якія выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае. |
| **3** | Студэнт ўзнаўляе нязначную частку вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы з грубымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **2** | Студэнт называе асобныя моўныя факты з вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **1** | Студэнт не валодае нават асобнымі фактамі з вучэбнага матэрыялу, не ўсведамляючы іх месца ў агульнай моўнай сістэме. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |

**Пратакол узгаднення рабочай праграмы з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці**

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| 1.Сучасная беларуская літаратурная мова.<br>2.Гісторыя беларускай літаратурнай мовы<br>3.Уводзіны ў мовазнаўства | мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбных праграм. | пратакол № 12<br>ад 19.05.2022 г. |